Праваабарончы цэнтр «Вясна»

# Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі ў 2020 годзе

## Аналітычны агляд

spring96.org

**СІТУАЦЫЯ З ПРАВАМІ ЧАЛАВЕКА Ў БЕЛАРУСІ У 2020 ГОДЗЕ**

**ВЫСНОВЫ**

- выбары прэзідэнта Рэспублікі Беларусь адбываліся на фоне беспрапынных рэпрэсіяў і ціску, у тым ліку ў дачыненні да непасрэдных іх удзельнікаў: сябраў ініцыятыўных груп, асоб, якія вылучаліся ў якасці кандыдатаў, блогераў, палітычных актывістаў, журналістаў і незалежных назіральнікаў;
- самі выбары не адпавядалі стандартам правядзення свабодных і дэмакратычных выбараў, суправаджаліся шматлікімі парушэннямі нацыянальнага выбарчага заканадаўства і фальсіфікацыямі, а іх афіцыйныя вынікі не адпавядаюць рэальнаму волевыяўленню беларускага народа;
- нязгода з афіцыйнымі вынікамі выбараў прывяла да масавых выступленняў грамадзян як у Мінску, так і ў іншых гарадах Беларусі. Нягледзячы на пераважна мірны характар сходаў, яны былі атакаваныя сіламі МУС з непрапарцыйным ужываннем фізічнай сілы, спецсродкаў, спецтэхнікі і зброі. У выніку дзеянняў сілавікоў сотні людзей атрымалі раненні і цяжкія калецтвы, як мінімум двое дэманстрантаў былі забітыя (Аляксандр Тарайкоўскі і Генадзь Шутаў), а адзін затрыманы памёр у выніку несвоечасовага аказання медыцынскай дапамогі (Аляксандр Віхор);
- тысячы затрыманых удзельнікаў пратэстаў у Мінску і іншых гарадах краіны сталі ахвярамі мэтанакіраваных катаванняў і іншых відаў жорсткага, бесчалавечнага і зневажальнага абыходжання. На дадзены момант ПЦ «Вясна» задакументавана больш за 1 000 сведчанняў ахвяр катаванняў. Іх аналіз дазваляе сцвярджаць пра тое, што катаванні насілі масавы, сістэмны характар і з'яўляліся арганізаванай, палітычна матываванай карнай акцыяй уладаў па запалохванні беларускага грамадства. Адсутнасць паўнавартаснага расследавання фактаў катаванняў у рамках узбуджаных крымінальных спраў з боку органаў пракуратуры і Следчага камітэта пацвярджаюць гэтыя высновы;
- беспакаранасць і ананімнасць супрацоўнікаў сілавых структур прывялі да новых фактаў катаванняў і жорсткага абыходжання ў дачыненні да затрыманых удзельнікаў пратэстных акцый, а таксама да гібелі ад рук супрацоўнікаў МУС і (або) афіляваных з уладай асоб удзельніка пратэстаў Рамана Бандарэнкі. Органамі следства так і не былі распачатыя крымінальныя справы па фактах гібелі А. Тарайкоўскага, Г. Шутава, А. Віхора і Р. Бандарэнкі;
- прававая сістэма краіны прадэманстравала сваю няздольнасць да абароны правоў грамадзян, поўную залежнасць ад дзеючай улады і актыўны ўдзел у палітычных рэпрэсіях у дачыненні да грамадзянаў краіны;
- затрыманні і арышты ўдзельнікаў мірных пратэстаў у 2020 г. набылі масавы характар. З пачатку выбарчай кампаніі ў траўні да канца года было затрымана больш за 33 тыс. грамадзян, вялікая частка якіх была пакараная судамі адміністрацыйнымі арыштамі і буйнымі штрафамі;
- улады актыўна ўжываюць крымінальныя справы ў мэтах палітычна матываванага пераследу грамадзян. Паводле звестак Генпракуратуры, у паствыбарчы перыяд крымінальныя справы былі ўзбуджаныя ў дачыненні да больш за 900 грамадзян. ПЦ «Вясна» вядомыя прозвішчы больш за 650 фігурантаў крымінальных спраў. 169

абвінавачаных былі прызнаныя беларускай праваабарончай супольнасцю палітвязнямі, і іх колькасць пастаянна расце;

- улады ўжывалі рэпрэсіі ў дачыненні да журналістаў у сувязі з іх прафесійнай дзейнасцю: па дадзеных БАЖ, 9 журналістаў на дадзены момант знаходзяцца ў ізаляцыі ў якасці падазраваных альбо абвінавачаных па крымінальных справах, 477 журналістаў былі затрыманыя, 97 адбылі адміністрацыйны арышт;
- 18 сябраў ПЦ «Вясна» на працягу года зведалі рэпрэсіі ў розных формах, у тым ліку затрыманні і адміністрацыйныя арышты. У СІЗА па абвінавачванні па арт. 293 КК да гэтага часу знаходзіцца каардынатарка валанцёрскай службы ПЦ «Вясна» Марыя (Марфа) Рабкова і валанцёр арганізацыі Андрэй Чапюк;
- нягледзячы на адсутнасць у 2020 г. фактаў новых расстрэлаў, Рэспубліка Беларусь працягвае ўжываць смяротнае пакаранне. На працягу года былі вынесены смяротныя прысуды ў дачыненні да трох чалавек, і на дадзены момант ў СІЗА ў чаканні выканання смяротных прысудаў знаходзяцца чатыры чалавекі;
- рэпрэсіі 2020 г. з'яўляюцца самымі масавымі ў найноўшай гісторыі Беларусі і сведчаць аб глыбокім крызісе з правамі чалавека ў краіне, які прывёў да міжнароднай ізаляцыі Беларусі і санкцый з боку краін ЕС, ЗША і Вялікабрытаніі. Адзіным адказам уладаў на патрабаванні палітычных пераўтварэнняў у краіне з боку большасці беларускага грамадства з'яўляецца ўзмацненне рэпрэсій і імітацыя агульнанацыянальнага дыялогу па г.зв. “канстытуцыйнай рэформе”. Дадзеная палітыка ўладаў толькі пагаршае крызіс і стварае передумовы для яго далейшага развіцця ў будучыні.

## I. УСТУП

2020 год пачаўся з масавых рэпрэсій у дачыненні да ўдзельнікаў і ўдзельніц пратэстных акцый супраць так званай паглыбленай інтэграцыі Беларусі і Расійскай Федэрацыі — працэсу, які замахваецца на незалежнасць дзяржавы.

Дзеянні, якія былі зроблены дзяржаўнымі інстытутамі ў якасці мер па недапушчэнні распаўсюджвання каронавіруснай інфекцыі COVID-19, аказаліся неэфектыўнымі. Парадаксальныя і супярэчлівыя выказванні вышэйшых службовых асобаў, замоўчванне маштабаў праблемы, адсутнасць вычарпальнай інфармацыі і відавочнае скажэнне статыстыкі выклікалі незадаволенасць у грамадстве. Недахопы і коснасць дзяржаўных механізмаў забеспячэння медыцынскіх устаноў сродкамі індывідуальнай абароны грамадскасць паспяхова кампенсавала ўласнымі валанцёрскімі намаганнямі.

У той жа час улады выкарысталі небяспекі каронавіруснай інфекцыі для апраўдання абмежаванняў і парушэнняў правоў чалавека, у тым ліку абмежаванняў на сустрэчы адвакатаў са сваімі падабароннымі ў СІЗА, ІЧУ і ЦІП, правядзенне ў парушэнне працэдур, устаноўленых ПВКаАП, судовых слуханняў па адміністрацыйных справах пры дапамозе Skype, правядзенне судовых слуханняў па палітычна матываваных крымінальных справах у закрытым рэжыме і інш.

Выбары прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з'яўляліся асноўным фактарам, які вызначыў далейшае развіццё ўнутрыпалітычнай сітуацыі ў краіне ў 2020 г. і прывёў да вострага крызісу правоў чалавека.

Правядзенне такіх маштабных агульнанацыянальных электаральных кампаній, як выбары прэзідэнта, традыцыйна прыводзіла да ўзмацнення рэпрэсій у дачыненні да палітычных апанентаў дзеючага палітычнага рэжыму і прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці. Выключэнне складалі толькі прэзідэнцкія выбары 2015 г.

Прымяненне жорсткіх рэпрэсій, у тым ліку ў дачыненні да непасрэдных удзельнікаў выбарчай кампаніі, у 2020 г. пачалося адразу ж пасля пачатку выбараў у траўні, а не ў поствыбарчы перыяд, як гэта было раней ў 2006 і 2010 гг.

Прымяненне рэпрэсій падчас выбарчай кампаніі было абумоўлена яе характарам, звязаным з з'яўленнем новых актыўных удзельнікаў, якія раней не былі вядомыя і не ўдзельнічалі ў палітычных працэсах у краіне: Святланы Ціханоўскай, былога кіраўніка Белгазпрамбанка Віктара Бабарыкі, былога чыноўніка Валерыя Цапкалы. Значная і раней небывалая актывізацыя грамадзян, якія ўтваралі велізарныя чэргі ля пікетаў па зборы подпісаў па вылучэнні альтэрнатыўных кандыдатаў, наглядна прадэманстравала запыт на палітычныя перамены ў большасці прадстаўнікоў беларускага грамадзтва.

Зваротнай рэакцыяй уладаў на гэтую нечаканую палітычную актыўнасць і сталі рэпрэсіі. Да пачатку дня галасавання 9 жніўня ў краіне ўжо налічваліся 24 палітычныя зняволеныя, прызнаныя такімі беларускай праваабарончай супольнасцю: блогеры, сябры ініцыятыўных груп па вылучэнні кандыдатаў у прэзідэнты, апазіцыйныя дзеячы. З сярэдзіны лета працягваюць утрымлівацца пад вартай Сяргей Ціханоўскі і Віктар Бабарыка, а таксама шэраг знакавых палітыкаў (М. Статкевіч, П. Севярынец) і папулярных блогераў (С. Пятрухін, А. Кабанаў).

Рэгістрацыя ў якасці кандыдата ў прэзідэнты Святланы Ціханоўскай і аб'яднанне штабоў найбольш папулярных патэнцыйных кандыдатаў (В. Бабарыка і В. Цапкала) надалі выбарчай кампаніі новы імпульс. Тры жанчыны — Святлана Ціханоўская, Марыя Калеснікава і Вераніка Цапкала — сталі ўвасабленнем імкнення грамадзян краіны да пераменаў, а сустрэчы з выбаршчыкамі з іх удзелам збіралі шматтысячныя аўдыторыі.

Сама ж выбарчая кампанія праходзіла ў традыцыйным для Беларусі ключы, і вынікі завяршэння першых яе этапаў паказалі імкненне ўлады захаваць поўны кантроль над выбарчым працэсам.

Варта адзначыць, што гэта былі першыя прэзідэнцкія выбары, назіранне за якімі не ажыццяўлялася міжнароднай місіяй БДІПЧ АБСЕ па прычыне немагчымасці арганізацыі паўнавартаснага назірання з-за наўмысна запозненага запрашэння з боку ўладаў краіны.

Галасаванне, і асабліва падлік галасоў выбаршчыкаў, прадэманстравалі, што вынікі выбараў былі сфальсіфікаваныя і агучаныя кіраўніцай ЦВК лічбы не маюць нічога агульнага з рэальным волевыяўленнем выбаршчыкаў. Да такіх высноваў па выніках правядзення незалежнага назірання за выбарамі прыйшлі і прадстаўнікі кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары».

Менавіта нязгода з афіцыйнымі вынікамі выбараў і паслужыла прычынай для пачатку масавых пратэстаў грамадзян у поствыбарчы перыяд, што, у сваю чаргу, прывяло да яшчэ большага ўзмацнення рэпрэсій.

9 жніўня пасля закрыцця выбарчых участкаў у многіх гарадах краіны грамадзяне выйшлі на вуліцу пратэставаць супраць фальсіфікацыі выбараў з патрабаваннем сумленнага падліку галасоў. Пратэсты працягваліся і ў наступныя дні, аж да канца года; няма падстаў чакаць іх спынення ў бліжэйшы час.

Нягледзячы на ў цэлым мірны характар пратэстаў, супраць дэманстрантаў, а таксама выпадковых людзей, якія апынуліся ў месцах судакранання з сілавымі падраздзяленнямі, 9, 10, 11 і 12 жніўня была прыменена непрапарцыйная фізічная сіла, спецсродкі і, упершыню ў гісторыі Беларусі, зброя: святлошумавыя гранаты, траўматычная зброя, спецыяльная аўтамабільная тэхніка, а ў асобных выпадках — баявая зброя. Гэта прывяло да вялікай колькасці ахвяр: раненняў, калецтваў і нават гібелі людзей (А. Тарайкоўскі, Г. Шутаў, А. Віхор).

Ужо 11 жніўня з'явіліся сведчанні таго, што мірныя дэманстранты і выпадковыя мінакі сталі ахвярамі беспрэцэдэнтных па размаху і жорсткасці карных мерапрыемстваў: супрацоўнікі міліцыі і спецпадраздзяленняў збівалі затрыманых пасля затрымання ў спецтранспарце, у памяшканнях і на тэрыторыі аддзелаў міліцыі, у іншых памяшканнях, якія належаць МУС, якія выкарыстоўваліся для назапашвання і побыту затрыманых, а таксама ў месцах утрымання затрыманых і арыштаваных — ізалятарах, турмах і следчых ізалятарах.

Медыкі, у тым ліку медыкі-валанцёры, у вольны ад працы час дзяжурылі на вуліцах гарадоў, аказвалі дапамогу параненым, а таксама распачалі максімальна магчымыя ў тых умовах намаганні да таго, каб выратаваць з ізалятараў і транспарту АУС людзей, якія сталі ахвярамі катаванняў і забароненага абыходжання.

Гэтая інфармацыя прывяла да яшчэ большага ўзмацнення пратэстных акцый у краіне. Грамадзяне масава выступалі супраць гвалту. Прадстаўнікі праваслаўнай і каталіцкай цэркваў выступілі з асуджэннем гвалту, што пасля спрычынілася да ўжыванні рэпрэсій і ціску ў дачыненні да некаторых рэлігійных дзеячаў і святароў: фактычнай дэпартацыі з краіны кіраўніка каталіцкай царквы арцыбіскупа Тадэвуша Кандрусевіча (вярнуўся ў краіну ў снежні пасля асабістых перамоваў А. Лукашэнкі з прадстаўніком Ватыкана), вынясення афіцыйнага папярэджання Генпракуратурай генеральнаму вікарыю Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі Рымска-каталіцкага касцёла ў Беларусі біскупу Юрыю Касабуцкаму і старшыні сінадальнага інфармацыйнага аддзела Беларускай праваслаўнай царквы Сяргею Лепіну.

Тым не менш кіраўніцтва МУС і дзяржавы ня асудзілі факты прымянення катаванняў супрацоўнікамі сілавых ведамстваў. На сённяшні дзень органамі пракуратуры і Следчым камітэтам не была ўзбуджана ніводнай крымінальнай справы па фактах гібелі пратэстоўцаў і прымянення да іх катаванняў і жорсткага абыходжання. У той жа час вядома аб не менш чым 1800 праверках па фактах катаванняў і забароненага абыходжання, вытворчасць па якіх зацягваецца. ПЦ «Вясна» задакументавана больш за 1 000 фактаў ужывання катаванняў. Прымяненне катаванняў і жорсткага абыходжання ў дачыненні да затрыманых працягваецца і на дадзены момант, а беспакаранасць прыводзіць да новых трагедый і гібелі людзей, такіх як забойства ўдзельніка пратэстаў Рамана Бандарэнкі.

Крымінальны перослед грамадзян стаў адным з асноўных відаў рэпрэсіяў, якія ўжываюцца ўладамі Беларусі. Па дадзеных Генеральнага пракурора, на 29 кастрычніка "па фактах масавых беспарадкаў і здзяйснення гвалтоўных дзеянняў у дачыненні да сілавікоў" было

ўзбуджана больш за 900 крымінальных спраў. Акрамя таго, распачатыя шматлікія крымінальныя справы па фактах абразаў службовых асоб і псавання маёмасці, хуліганства, супраціву ці гвалту ў дачыненні да супрацоўнікаў міліцыі, па эканамічных складах злачынстваў.

Крызіс з правамі чалавека прывёў да рэзкага павелічэння колькасці палітвязняў, якая складае 169 чалавек, і гэта не канчатковая іх колькасць. Усяго праваабаронцам вядомыя дадзеныя больш за 650 чалавек, у дачыненні да якіх узбуджаны крымінальныя справы ў перыяд выбараў і ў поствыбарчы перыяд.

Улады краіны ўжываюць самыя розныя формы рэпрэсій у дачыненні да іншадумцаў, у тым ліку звальненні з працы актывістаў страйкавага руху на шэрагу дзяржаўных прадпрыемстваў («Беларуськалій», «Гродна Азот», «Нафтан» і інш.). Рэпрэсіям у выглядзе адлічэнняў з ВНУ падвергліся студэнты, якія актыўна ўдзельнічалі ў студэнцкіх мірных акцыях пратэсту і салідарнасці. Так, незалежная студэнцкая арганізацыя ЗБС сабрала дадзеныя аб 399 затрыманых студэнтах і 131 факце іх адлічэнняў. Фіксаваліся выпадкі звальненняў з працы выкладчыкаў ВНУ, медыцынскіх работнікаў у сувязі з іх палітычнымі поглядамі і перакананнямі. Асабліваму ціску падвяргаліся супрацоўнікі сілавых ведамстваў, якія заявілі аб нязгодзе з дзеяннямі ўладаў і звольніліся з дзяржорганаў.

Улады выкарысталі нават такі від рэпрэсій, як гвалтоўнае выправаджэнне з краіны (С. Ціханоўская, В. Кавалькова, спроба выправаджэння М. Калеснікавай).

Упершыню ў найноўшай гісторыі краіны па факце дзейнасці Каардынацыйнай рады, створанай прадстаўнікамі апазіцыі з мэтай удзелу ў перамовах з уладай па вырашэнні ўнутрыпалітычнага крызісу ў краіне, была ўзбуджаная крымінальная справа па арт. 357 КК “Змова і іншыя дзеянні, учыненыя з мэтай захопу дзяржаўнай улады”.

Рэпрэсіі ў дачыненні да грамадзян у 2020 г. набылі масавы характар. Улады Беларусі дапускаюць масавыя і сістэмныя парушэнні правоў чалавека, а прававая сістэма краіны не ў сілах забяспечыць належную прававую абарону парушаных правоў і цалкам пераарыентаваная на рэпрэсіі.

Менавіта ў сувязі з масавымі і сістэмнымі парушэннямі правоў чалавека ў дачыненні да Беларусі ўжо паўторна быў запушчаны Маскоўскі механізм АБСЕ, прайшлі слуханні і прынятая рэзалюцыя Савета па правах чалавека ААН, запушчаны шэраг іншых міжнародных працэдур.

Правядзенне несумленных выбараў і масавыя парушэнні правоў чалавека прывялі рэжым Лукашэнкі да міжнароднай ізаляцыі з боку краін Захаду: краіны-ўдзельніцы ЕС, Вялікабрытанія, ЗША і Канада заявілі аб непрызнанні Лукашэнкі легітымна абраным прэзідэнтам краіны, ЕС і ЗША ўвялі палітычныя і эканамічныя санкцыі ў дачыненні да шэрагу службовых асоб і кампаній краіны.

Афіцыйны Крэмль, наадварот, выступіў з поўнай палітычнай падтрымкай рэжыму А. Лукашэнкі, заявіўшы пра тое, што ён з’яўляецца адзіным законна абраным на выбарах кіраўніком краіны. Акрамя таго, улады Расійскай Федэрацыі па просьбе А. Лукашэнкі стварылі і адправілі на расійска-беларускую мяжу рэзерв сілавікоў “на выпадак значнай дэстабілізацыі ўнутрыпалітычнай сітуацыі ў Беларусі”. На працягу года Расія працягвала

аказваць падтрымку палітычнаму рэжыму Беларусі, навязваючы пры гэтым свой план магчымага ўрэгулявання крызісу праз правядзенне канстытуцыйнай рэформы. Варта нагадаць, што ў пачатку года ўлады Расійскай Федэрацыі аказвалі значны як палітычны, так і эканамічны ціск на ўлады Беларусі з мэтай прасоўвання парадку т.зв. "паглыбленай інтэграцыі". У выніку новага крызісу ў адносінах Беларусі з краінамі Захаду, пагрозы суверэнітэту краіны з боку Расіі яшчэ больш павысіліся.

Упершыню ў гісторыі Беларусі масавыя пратэсты з патрабаваннем сыходу з пасады прэзідэнта А. Лукашэнкі і правядзення новых выбараў носяць такі масавы і доўгачасовы характар, і ўпершыню спробы сілавых разгонаў дэманстрацый прывялі да гібелі некалькіх дэманстрантаў. Адзіным адказам уладаў на патрабаванні палітычных зменаў з боку грамадства застаюцца рэпрэсіі і спробы імітацыі шырокага грамадскага дыялогу аб маючай адбыцца канстытуцыйнай рэформе, змест якой застаецца непублічным для грамадства.

Упершыню за 26 гадоў свайго кіравання А. Лукашэнка страціў падтрымку і легітымнасць сярод большасці беларускага грамадства, што можа прывесці ў агляднай будучыні да сур'ёзных зменаў у краіне.

## II. ПАЛІТЫЧНА МАТЫВАВАНЫ КРЫМІНАЛЬНЫ ПЕРАСЛЕД І ПАЛІТЫЧНЫЯ ВЯЗНІ

На працягу 2020 г. крымінальны пераслед грамадзян заставаўся адным з асноўных відаў рэпрэсіяў, якія ўжываліся ўладамі Беларусі ў перыяд выбараў і ў поствыбарчы перыяд. Усяго, па дадзеных Генпракуратуры, у поствыбарчы перыяд крымінальныя справы былі ўзбуджаная ў дачыненні да больш чым 900 грамадзян, пры гэтым ПЦ «Вясна» вядомыя прозвішчы больш за 650 чалавек.

У мэтах палітычна матываванага крымінальнага пераследу ўлады выкарыстоўвалі самы шырокі спектр артыкулаў Крымінальнага кодэкса. Усе ўзбуджаныя крымінальныя справы можна ўмоўна падзяліць на некалькі груп, у залежнасці ад артыкулаў КК або абставінаў, падзеяў і фігурантаў дадзеных спраў.

Яшчэ ў пачатку выбарчай кампаніі ў траўні ўлады распачалі меры відавочна прэвентыўнага характару, накіраваныя на ізаляцыю шэрагу апазіцыйных дзеячаў і блогераў. Адным з першых затрыманых стаў Сяргей Ціханоўскі — вядомы блогер і аўтар папулярнага YouTube-канала «Краіна для жыцця», які заяўляў раней пра свае планы вылучацца кандыдатам на выбарах прэзідэнта, але стаў у выніку кіраўніком ініцыятыўнай групы па вылучэнні ў якасці кандыдата ў прэзідэнта Святланы Ціханоўскай. Сяргей Ціханоўскі быў затрыманы 29 траўня падчас правядзення ім пікету па зборы подпісаў за вылучэнне Святланы Ціханоўскай, які праходзіў у г. Гродна ў рамках выбарчай кампаніі ў месцы, не забароненым для гэтых мэтаў рашэннем мясцовага выканкама. Затрыманне Ціханоўскага стала вынікам дрэнна арганізаванай правакацыі спецслужбаў, якая патрапіла ў аб'ектывы шматлікіх відэакамер журналістаў і прадэманстравала, што з боку Ціханоўскага не было здзейснена якіх-небудзь супрацьпраўных дзеянняў. У снежні ініцыятывай BYPOL былі апублікаваныя матэрыялы, якія пацвярджаюць версію аб арганізаванай спецслужбамі ў дачыненні да С. Ціханоўскага правакацыі і яго беспадстаўным затрыманні.

8 чэрвеня С. Ціханоўскаму і затрыманым разам з ім грамадзянам было прад'яўленае абвінавачанне па ч. 1 арт. 342 КК (арганізацыя альбо актыўны ўдзел у групавых дзеяннях, якія груба парушаюць грамадзкі парадак). Пазней Ціханоўскі быў абвінавачаны таксама па

арт. 191 КК (перашкода правядзенню выбараў і працы Цэнтрвыбаркама) па асабістай заяве кіраўніцы ЦВК Л. Ярмошынай, а таксама па арт. 130 (распальванне варожасці ў дачыненні да іншай сацыяльнай групы — супрацоўнікаў міліцыі) і па арт. 293 Крымінальнага кодэкса.

Падзеі ў Гродне 29 траўня паслужылі фармальнай нагодай для ізаляцыі і абвінавачванні па арт. 342 КК цэлага шэрагу вядомых блогераў і актывістаў, звязаных з арганізацыяй або ўдзелам у тых падзеях. Так, паводле гэтага абвінавачвання былі ізаляваны блогеры Сяргей Пятрухін і Аляксандр Кабанаў, Дзмітрый Казлоў, Уладзімір Цыгановіч і іншыя фігуранты т.зв. “справы Ціханоўскага”.

Таксама па арт. 342 КК да дня галасавання былі ўзяты пад варту вядомы апазіцыйны палітык Мікалай Статкевіч (пазней таксама абвінавачаны па п. 13 ч. 2 арт. 293 КК — “падрыхтоўка да ўдзелу ў масавых беспарадках”). Пасля спробаў сілавога разгону выступленняў грамадзян пасля адмовы ў рэгістрацыі ЦВК найбольш папулярных на той момант патэнцыйных кандыдатаў у прэзідэнты В. Бабарыкі і В. Цапкалы была распачатая крымінальная справа арт. 342 КК у дачыненні як мінімум 13 чалавек.

У перыяд рэгістрацыі сабраных подпісаў па вылучэнні кандыдатам у прэзідэнты 18 чэрвеня быў затрыманы і ўзяты пад варту былы кіраўнік Белгазпрамбанка Віктар Бабарыка. Яго затрыманню папярэднічаў шэраг публічных пагрозаў з боку дзеючага кіраўніка дзяржавы А. Лукашэнкі. Разам з Бабарыкам былі затрыманыя і некалькі сябраў яго ініцыятыўнай групы, у тым ліку і яе кіраўнік Эдуард Бабарыка. Палітычна матываваны характар іх пераследу не выклікаў у праваабаронцаў краіны ніякіх сумневаў.

Усе затрыманыя былі пазней абвінавачаныя па шэрагу эканамічных артыкулаў КК. Варта адзначыць, што эканамічныя артыкулы актыўна выкарыстоўваліся ўладамі для пераследу бізнесменаў, якія тым ці іншым чынам ўдзельнічалі ў палітычнай кампаніі В. Бабарыкі альбо падтрымлівалі грамадскія ініцыятывы (А. Васілевіч, Л. Уласава, Ю. Шардыка, Д. Рабцэвіч, В. Куўшынаў, У. Міхалап).

У поствыбарчы перыяд найбольшая колькасць крымінальных справаў была ўзбуджана ў дачыненні да ўдзельнікаў пратэстных акцый па арт. 342 і 293 Крымінальнага кодэкса. Так, ПЦ «Вясна» вядомыя прозвішчы больш за 180 фігурантаў справы аб масавых беспарадках. Пасля маршу ва ўрочышчы Курапаты (мемарыял на месцы масавых расстрэлаў ахвяр сталінскіх рэпрэсій) 1 лістапада СК заявіў аб узбуджэнні крымінальнай справы па арт. 342 КК у дачыненні да 231 чалавека.

Пры гэтым варта адзначыць, што практычна ўсе сходы грамадзян, якія праходзілі ў поствыбарчы перыяд, насілі мірны характар.

Вялікую катэгорыю крымінальных спраў складалі справы, звязаныя з абвінавачваннямі ва ўжыванні гвалту ў дачыненні да супрацоўнікаў міліцыі, супрацівам з ужываннем гвалту (арт. 363, 364, 366 КК).

Як паказалі вынікі маніторынгу судовых працэсаў па некаторых з дадзенай катэгорыі спраў, суды пры разглядзе спраў не даюць належнай ацэнкі законнасці дзеянняў супрацоўнікаў міліцыі і пры вынясенні прысудаў першапачаткова зыходзяць з таго, што яны ажыццяўлялі сваю законную дзейнасць па ахове грамадскага парадку пры правядзенні грамадзянамі несанкцыянаваных масавых мерапрыемстваў. Затрыманні ўдзельнікаў такіх сходаў,

прымяненне ў дачыненні да іх фізічнай сілы, спецыяльных сродкаў таксама, на думку суддзяў, носіць законных характар. Адпаведна, усякага роду непадпарадкаванне, супраціў, а тым больш прымяненне гвалту ў дачыненні да прадстаўнікоў МУС, на іх думку, з'яўляецца злачынным.

Пазіцыя экспертаў ПЦ «Вясна» па дадзеных справах заключаецца ў тым, што мірныя сходы грамадзян павінны знаходзіцца пад абаронай дзяржавы, а ўсякага роду дзеянні па іх гвалтоўным спыненні, затрыманне іх удзельнікаў, прымяненне да іх гвалту, з'яўляюцца непрапарцыйнымі абмежаваннямі свабоды мірных сходаў, якія выходзяць за рамкі дапушчальных абмежаванняў. Адпаведна, такога роду дзеянні міліцыі нельга разглядаць як законную дзейнасць па абароне і ахове грамадскага парадку, і ў выпадках прычынення ў дачыненні да прадстаўнікоў МУС справакаванага імі ж гвалту ў адказ з боку ўдзельнікаў пратэстаў дадзеныя дзеянні неабходна разглядаць зыходзячы з цяжкасці нанесенай шкоды здароўю. У большасці назіраных выпадкаў ніякага шкоды здароўю дзеяннямі абвінавачаных прычынена не было або шкода была нязначнай, альбо гвалту як такога наогул не ўжывалася.

Паказальным у гэтай сувязі з'яўляўся судовы працэс у дачыненні да грамадзянкі Беларусі і Швейцарыі Наталлі Хершэ, якая была асуджаная судом Савецкага р-на г. Мінска па арт. 363 КК (супраціў супрацоўніку міліцыі) да двух з паловай гадоў пазбаўлення волі і прызнана беларускай праваабарончай супольнасцю палітычнай зняволенай.

Шэраг абвінавачаных быў прыгавораны да рэальных тэрмінаў пазбаўлення волі па арт. 339 КК (хуліганства) за нанясенне графіці на грамадска-палітычныя тэмы, што з'яўляецца дапушчальнай формай выказвання меркаванняў. Шэраг крымінальных спраў па нанясенні графіці быў таксама узбуджаны па арт. 341 КК (апаганьванне збудаванняў і псаванне маёмасці). Асаблівы рэзананс выклікала асуджэнне судом Фрунзенскага р-на г. Мінска да рэальных тэрмінаў пазбаўлення волі (В. Гуліс і М. Паўлюшчык) і абмежавання волі з накіраваннем у ПУАТ (Д. Граханаў і І. Самусенка) абвінавачаных па ч. 2 арт. 339 КК за нанясенне надпісу "Не забудзем" у раёне метро «Пушкінская» ў г. Мінску (месца забойства сілавікамі ўдзельніка пратэстнай акцыі Аляксандра Тарайкоўскага).

Яшчэ адну катэгорыю складаюць крымінальныя справы, якія ўзбуджаюцца па дыфамацыйныя артыкулах Крымінальнага кодэкса, — арт. 368 (абраза прэзідэнта Рэспублікі Беларусь), арт. 369 (абраза службовай асобы), а таксама справы, звязаныя з абразай дзяржаўных сімвалаў (арт. 370).

ПЦ «Вясна» вядома некалькі дзясяткаў выпадкаў асуджэння грамадзян да абмежавання волі з накіраваннем у ПУАТ па арт. 369 КК, а таксама аб асуджэнні да пазбаўлення волі за абразу прэзідэнта. У сваёй сумеснай заяве аб прызнанні палітычнымі вязнямі А. Раманава, М. Чарняўскага, Д. Кулакоўскага і С. Гардзіевіча беларуская праваабарончая супольнасць у чарговы раз заклікала ўлады краіны да дэкрыміналізацыі дыфамацыі і вызвалення ўсіх асуджаных па адпаведных артыкулах КК.

Асобна варта адзначыць крымінальны пераслед сяброў Каардынацыйнай рады альбо распачатых па факце яго стварэння і дзейнасці крымінальных спраў.

Варта адзначыць, што з самага пачатку свайго стварэння Каардынацыйная рада была рэзка негатыўна ўспрынятая кіраўніцтвам краіны і асабіста А. Лукашэнкам, які яшчэ 18 жніўня

заявіў аб незаконным характары яе дзейнасці і спробе захопу ўлады. Праз два дні пасля яго выступу, 20 жніўня, Генеральнай пракуратурай Рэспублікі Беларусь па факце стварэння і дзейнасці Каардынацыйнай рады была ўзбуджаная крымінальная справа па арт. 361 КК.

9 верасня быў затрыманы сябар прэзідыума Каардынацыйнай рады па ўрэгуляванні палітычнага крызісу, адвакат Максім Знак і адвакат Марыі Калеснікавай Ілля Салей. У іх кватэрах прайшлі ператрусы, а затрыманыя былі дастаўлены на допыт у Следчы камітэт.

Гэтым затрыманнях папярэднічала выкраданне ў цэнтры Мінска 7 верасня невядомымі асобамі адной з лідарак прэзідыума Каардынацыйнай рады Марыі Калеснікавай.

Як пазней стала вядома, яна разам з яшчэ двума сябрамі Каардынацыйнай рады, Антонам Раднянковым і Іванам Краўцовым, была гвалтоўна прывезена на беларуска-ўкраінскую мяжу для выправаджэння з краіны.

Аднак, парваўшы свой пашпарт на памежным пераходзе і выскачыўшы з аўтамабіля, Марыя Калеснікава перашкодзіла рэалізацыі спецаперацыі, арганізаванай беларускімі спецслужбамі, па вывазу няўгодных грамадзян за межы краіны. Пасля гэтага пра месца знаходжання М. Калеснікавай суткі не было нічога вядома.

9 верасня СК афіцыйна паведаміў, што Галоўным следчым упраўленнем Следчага камітэта працягваецца расследаванне крымінальнай справы, узбуджанай Генеральнай пракуратурай Рэспублікі Беларусь па ч. 3 арт. 361 Крымінальнага кодэкса (заклікі да дзеянняў, накіраваных на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь). У дачыненні да падазраваных Марыі Калеснікавай і Максіма Знака з санкцыі пракурора была абраная мера стрымання ў выглядзе заключэння пад варту. Таксама па падазрэнні ў здзяйсненні злачынства (ч. 3 арт. 361 КК) затрыманы Ілля Салей (пазней яму была змененая мера стрымання на хатні арышт).

21 снежня Генеральная пракуратура паведаміла аб узбуджэнні крымінальных спраў у дачыненні да сябраў Каардынацыйнай рады Святланы Ціханоўскай, Марыі Калеснікавай, Максіма Знака, Паўла Латушкі, Вольгі Кавальковай, Сяргея Дылеўскага і іншых на падставе ч. 1 арт. 361-1 КК (стварэнне экстрэмісцкага фарміравання), а ў дачыненні да заснавальніка фонда ўзаемадапамогі BY_HELP Аляксея Лявончыка — па арт. 361-2 КК (фінансаванне дзейнасці экстрэмісцкага фарміравання). Таксама па факце дзейнасці СК па даручэнні Генпракуратуры ўзбуджаная крымінальная справа па ч. 1 арт. 357 КК (змова або іншыя дзеянні, учыненыя з мэтай захопу дзяржаўнай улады).

Асобна варта адзначыць крымінальны пераслед журналістаў у сувязі з ажыццяўленнем імі сваіх прафесійных абавязкаў. Паводле звестак БАЖ, 9 журналістаў на дадзены момант знаходзяцца ў СІЗА па распачатых у дачыненні да іх крымінальных справах; у дачыненні да 15 узбуджаны крымінальныя справы. Асаблівы рэзананс выклікалі выпадкі крымінальнага пераследу журналістак тэлеканала «Белсат» Дар'і Чульцовай і Кацярыны Бахвалавай (Андрэевай), а таксама журналісткі інтэрнэт-партала TUT.by Кацярыны Барысевіч.

Рэпрэсіі былі ўжытыя і ў дачыненні да праваабаронцаў. Так, на працягу года 18 сябраў ПЦ »Вясна» падвяргаліся розным формам пераследу, у тым ліку затрыманням і адміністрацыйным арыштам. 17 верасня супрацоўнікамі ГУБАЗіК ў г. Мінску была затрыманая каардынатарка валанцёрскай службы ПЦ «Вясна» Марфа Рабкова. З тых часоў

яна знаходзіцца ў СІЗА №1 і абвінавачваецца ў здзяйсненні злачынства па ч. 3 арт. 293 КК (падрыхтоўка і фінансаванне масавых мерапрыемстваў). 2 кастрычніка быў затрыманы і змешчаны пад варту ў СІЗА валанцёр ПЦ «Вясна» Андрэй Чапюк, які абвінавачваецца па ч. 2 арт. 293 КК (удзел у масавых беспарадках).

2020 г. стаў годам самых масавых рэпрэсій за ўсю найноўшую гісторыю Беларусі. Колькасць палітычных зняволеных, прызнаных такімі беларускай праваабарончай супольнасцю, пастаянна расце і на дадзены момант складае 169 чалавек. Патэнцыйна ж іх колькасць можа шматкроць ўзрасці.

## III. ПРАВА НА ЖЫЦЦЁ. ПРАБЛЕМА СМЯРОТНАГА ПАКАРАННЯ

У ходзе падаўлення спецпадраздзяленнямі мірных акцый пратэсту супраць фальсіфікацыі выбараў у жніўні 2020 года ад рук іх супрацоўнікаў загінулі не менш за два пратэстоўцы — Аляксандр Тарайкоўскі ў Мінску і Генадзь Шутаў ў Брэсце. Непасрэдна пасля затрымання, пры адсутнасці своечасовай медыцынскай дапамогі, памёр Аляксандр Віхор з Гомеля.

11 лістапада ў Мінску невядомымі быў збіты і затрыманы Раман Бандарэнка; у ноч на 12 лістапада ён быў дастаўлены ў бальніцу з Цэнтральнага РУУС г. Мінска з цяжкімі траўмамі, ад якіх неўзабаве памёр. Шматлікія відэазапісы і сведчанні відавочцаў дазваляюць зрабіць выснову пра тое, што да гібелі Р. Бандарэнкі з высокай ступенню верагоднасці датычныя супрацоўнікі МУС Беларусі і асобы з непосрэднага атачэння А. Лукашэнкі. Улады не распачалі эфектыўных мер па расследаванні ўсіх гэтых выпадкаў, а, наадварот, паспрабавалі дэзінфармаваць грамадскасць пра абставіны здарэнняў.

У Беларусі дагэтуль захоўваецца пакаранне смерцю: у 2020 годзе вынесены і ўступіў у сілу смяротны прысуд за забойства Іллі і Станіславу Косцевым. Смяротны прысуд Віктару Скрундзіку па апеляцыйнай скарзе абвінавачанага і яго абаронцы быў адменены Вярхоўным Судом, яго справа паўторна разглядаецца Мінскім абласным судом. Апошні раз смяротнае пакаранне ў Беларусі ужывалася 17 снежня 2019 года; цяпер у камерах смяротнікаў выканання прысуду чакаюць чацвёра асуджаных: браты Косцевы, Віктар Сергель і Віктар Паўлаў.

Між тым 12 сакавіка 2020 года Камітэт па правах чалавека ААН прыняў рашэнне, у якім прызнаў, што ў справе Генадзя Якавіцкага беларускімі ўладамі быў дапушчаны шэраг парушэнняў яго правоў, гарантаваных Міжнародным пактам аб грамадзянскіх і палітычных правах. Індывідуальны зварот асуджанага да смяротнага пакарання Якавіцкага быў зарэгістраваны ў Камітэце па правах чалавека ААН 17 ліпеня 2016 года. Нягледзячы на тое, што Камітэт ААН прасіў не прыводзіць у выкананне смяротны прысуд на час разгляду скаргі, Якавіцкага расстралялі ў СІЗА №1 Мінска 5 лістапада 2016 года. Камітэт ААН прыйшоў да высновы, што ў дадзенай сітуацыі мела месца адвольнае пазбаўленне жыцця расстралянага. Акрамя гэтага, было парушана права Г. Якавіцкага на справядлівае судовае разбіральніцтва незалежным і бесстароннім судом, а таксама права на прэзумпцыю невінаватасці. Гэта не першае падобнае рашэнне КПЧ.

## IV. АБМЕЖАВАННІ СВАБОДЫ МІРНЫХ СХОДАЎ

Дзеючае ў Беларусі заканадаўства і практыка яго прымянення, як і раней, парушаюць і адвольна абмяжоўваюць свабоду мірных сходаў і свабоду выказвання меркаванняў. Закон

не ўтрымлівае нормаў пра прэзумпцыю на карысць ажыццяўлення права на мірныя сходы; працэс атрымання дазволу на правядзенне масавых мерапрыемстваў, у тым ліку на адзіночны пікет, па-ранейшаму спалучаны з празмернымі патрабаваннямі і абмежаваннямі, а таксама са значнымі выдаткамі. Паведамляльны парадак правядзення некаторых відаў мірных сходаў ўжываўся з паўсюднымі абмежаваннямі правоў удзельнікаў.

У папярэднія тры гады ў Беларусі адбывалася істотнае зніжэнне колькасці людзей, прыцягнутых да адміністрацыйнай адказнасці, у тым ліку ў выглядзе адміністрацыйнага арышту, за рэалізацыю свабоды мірных сходаў і выказвання меркавання. Аднак гэта не сведчыла пра лібералізацыю дзяржаўнай палітыкі, а было следствам згасання пратэстнай актыўнасці ў цэлым. Так, па дадзеных ПЦ «Вясна», у 2019 годзе было зафіксавана больш за 230 выпадкаў пераследу грамадзян за ажыццяўленне гэтых свабодаў.

У 2020 годзе рэпрэсіі ў дачыненні да ўдзельнікаў мірных сходаў і акцый пратэсту працягваліся на працягу ўсяго года: ПЦ «Вясна» зафіксаваў каля 200 выпадкаў прыцягнення да адміністрацыйнай адказнасці ў выглядзе штрафаў і адміністрацыйнага арышту за перыяд з пачатку года да старту кампаніі па выбарах прэзідэнта; за перыяд выбарчай кампаніі рэпрэсіі ўзмацніліся, нягледзячы на тое, што заканадаўства ўстанаўлівае значна менш абмежаванняў на правядзенне публічных масавых мерапрыемстваў у гэты перыяд (каля 550 накладзеных адміністрацыйных спагнанняў) і дасягнулі свайго максімуму 9-13 жніўня, калі ў Беларусі ў розных гарадах былі жорстка здушаныя з прымяненнем спецсродкаў, зброі і спецтэхнікі мірныя акцыі пратэсту супраць фальсіфікацыі вынікаў выбараў; тады ж затрымана каля 7 000 іх удзельнікаў, большасць з якіх былі аштрафаваныя і пакараныя адміністрацыйнымі арыштамі, і, акрамя таго, сталі ахвярамі сістэматычных масавых катаванняў і жорсткага, зневажальнага, бесчалавечнага абыходжання. З таго часу вулічныя пратэсты рэгулярна працягваюцца, нягледзячы на сілавыя разгоны з прымяненнем спецсродкаў, зброі і спецтэхнікі, а сотні іх удзельнікаў амаль штотыдзень падвяргаюцца адміністрацыйным спагнанням.

Агульная колькасць затрыманых за час паслявыбарчых пратэстаў з улікам розных крыніц дадзеных склала больш за 31 000 чалавек. Валанцёрская служба ПЦ «Вясна» сабрала звесткі пра 26 579 затрыманняў у 46 населеных пунктах Беларусі за гэты перыяд. Сярод затрыманых 20% — жанчыны, 171 чалавек — непаўналетнія, 57 чалавек — замежнікі.

Такім чынам, за 2020 год ахвярамі рэпрэсій сталі больш за 33 000 удзельнікаў мірных пратэстаў.

Некаторыя ўдзельнікі масавых мерапрыемстваў падвяргаюцца доўгім тэрмінам арышту (да двух і больш месяцаў). Суды, выкарыстоўваючы недахопы заканадаўства, прызначаюць ім паслядоўна некалькі спагнанняў.

Пераслед удзельнікаў мірных сходаў не абмяжоўваецца адміністратыўным. Многія з іх былі звольнены з працы ці адлічаны з навучальных установаў. Так, 27 кастрычніка Аляксандр Лукашэнка заявіў пра неабходнасць звальнення страйкоўцаў па палітычных матывах і адлічэнні з навучальных установаў студэнтаў, якія ходзяць “у парушэнне закона на несанкцыянаваныя акцыі”.

Тым з пратэстоўцаў, хто падвяргаўся затрыманням, пракуратура пагражае крымінальнай адказнасцю.

## V. ПАРУШЭННІ СВАБОДЫ ВЫКАЗВАННЯ МЕРКАВАННЯЎ, АБМЕЖАВАННІ НА СВАБОДУ РАСПАЎСЮДЖВАННЯ ІНФАРМАЦЫІ, ПЕРАСЛЕД ЖУРНАЛІСТАЎ

Разнастайныя формы выказвання меркаванняў выбарча і адвольна абмяжоўваюцца ўладамі ў тым выпадку, калі яны па змесце не супадаюць з праўладнай ідэалогіяй. Заканадаўства аб масавых мерапрыемствах распаўсюджваецца на такія формы выказвання меркавання, як выкарыстанне сцягоў і сімвалаў, у тым ліку на прыватных тэрыторыях і ў памяшканнях: адміністрацыйнай адказнасці па арт. 23.34 КаАП у выглядзе буйных штрафаў і арышту падвяргаліся тыя грамадзяне, якія вывешвалі на сваіх балконах і вокнах нацыянальныя бел-чырвона-белыя сцягі, якія сталі сімвалам пратэсту.

Заканадаўства аб барацьбе з экстрэмізмам таксама адвольна выкарыстоўваецца для абмежавання свабоды выказвання меркаванняў: рашэннем суда пад забарону патрапілі “інфармацыйны канал інтэрнэт месенджэра “Telegram” – “NEXTA-Live” (t.me/nexta_live) і лагатып (лічбавы вадзяны знак) “NEXTA” (папулярны Telegram-канал, які ўлады абвінавачвалі ў каардынацыі пратэстаў), а таксама некалькі відэарэпартажаў YouTube-каналаў грамадска-палітычнай тэматыкі.

Палітычная пазіцыя і выказванні папулярных спартсменаў і тэлевядучых сталі нагодай для іх пераследу, звальнення і скасавання кантрактаў.

Прыватныя кампаніі, якія падтрымалі ў розных формах акцыі пратэсту, падвергліся пазачарговым праверкам дзяржаўных кантралюючых органаў, па выніках якіх на іх былі накладзеныя непамерна высокія штрафы.

У 2020 годзе пад удар рэпрэсіўнай сістэмы патрапілі журналісты, блогеры і сродкі масавай інфармацыі.

З пачатку года некалькі незалежных журналістаў і блогераў былі затрыманыя і абвінавачаныя ва ўдзеле ў несанкцыянаваных мерапрыемствах; суды пакаралі іх арыштамі за ажыццяўленне сваіх прафесійных абавязкаў падчас мірных сходаў.

У чэрвені, у разгар выбарчай кампаніі, былі змешчаныя пад варту і абвінавачаныя ў арганізацыі і падрыхтоўцы групавых дзеянняў, што груба парушаюць грамадзкі парадак, больш за дзясятак папулярных блогераў і аўтараў Telegram-каналаў. Пазней да іх далучыліся некалькі адміністратараў папулярных пратэстных Telegram-каналаў грамадска-палітычнага зместу.

23 верасня стала вядома аб тым, што галоўны рэдактар «Нашай Нівы» Ягор Марціновіч з’яўляецца падазраваным па арт. 188 Крымінальнага кодэкса (паклёп): гаворка ідзе пра публікацыю, у якой вызвалены пасля арышту па палітычных матывах Уладзіслаў Сакалоўскі заявіў, што яго ў ЦІП ГУУС Мінгарвыканкама збіў намесніка кіраўніка МУС Аляксандр Барсукоў.

Рэпрэсіі не абмежаваліся арыштамі: некалькі журналістаў сталі ахвярамі збіцця падчас разгонаў мірных акцый пратэсту, а 11 жніўня ў журналістку «Нашай Нівы» Наталлю

Лубнеўскую супрацоўнік спецпадраздзялення МУС прыцэльна стрэліў з 10-метровай адлегласці і беспакарана прычыніў адкрытую рану.

Журналісты СМІ, нягледзячы на тое, што мелі адпаведныя абазначэнні, сталі асобнай цэллю для супрацоўнікаў АУС: журналістаў затрымлівалі і абвінавачвалі ў каардынацыі пратэстных акцый альбо ва ўдзеле ў несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах і каралі буйнымі штрафамі і адміністратыўным арыштам.

Датычных да асвятлення сітуацыі з гібеллю Рамана Бандарэнкі і выкліканых яго смерцю акцый пратэсту журналістак Кацярыну Барысевіч (TUT.by), Кацярыну Андрэеву і Дар'ю Чульцову («Белсат») арыштавалі і змясцілі ў СІЗА па надуманых абвінавачваннях.

У жніўні МЗС адмовіла ў акрэдытацыі вялікай колькасці замежных журналістаў, а 29 жніўня пазбавіла акрэдытацыі чатырох журналістаў «Радыё Свабода», двух журналістаў BBC, двух журналістаў Associated Press, двух журналістаў нямецкага канала ARD, а таксама журналістаў AFP, Reuters, Deutsche Welle і RFI.

У дзень выбараў, 9 жніўня, з раніцы быў паступова абмежаваны доступ да розных сацыяльных сетак і сайтаў, выбарачна заблакаваны трафік, а з вечара да раніцы наступнага дня і ў наступныя дні па ўсёй тэрыторыі краіны быў адключаны мабільны інтэрнэт. Абмежаванні былі ў асноўным зняты 12 жніўня, аднак некаторыя рэсурсы засталіся заблакаванымі "па рашэнні дзяржаўных органаў" да цяперашняга часу, у тым ліку версія сайта ПЦ «Вясна» spring96.org на рускай мове і рэсурс elections2020.spring96.org, які асвятляў выбары прэзідэнта.

У канцы жніўня дзяржаўны Дом друку адмовіўся друкаваць газеты «Комсомольская правда в Беларуси», «Народная воля», «Свободные новости плюс» і «Белгазета», якія аб'ектыўна асвятлялі пратэсты. У выніку тры апошнія выданні спынілі выпуск друкаванага СМІ: «Белсаюздрук» і «Белпошта» адмовіліся распаўсюджваць газеты, надрукаваныя не ў Доме друку. Такім чынам, шэраг незалежных друкаваных СМІ больш недаступныя чытачу.

9 лістапада ў рэдакцыі незалежнага рэгіянальнага выдання «Газета Слонімская» і ў кватэры ў галоўнага рэдактара газеты Ганны Валадашчук правялі ператрус, была канфіскаваная ўся тэхніка выдаўца і прадпрыемства, паралізаваны выпуск газеты. Таксама ператрус адбыўся ў рэдакцыі газеты «Ганцавіцкі час».

3 снежня Эканамічны суд Мінска пастанавіў пазбавіць інтэрнэт-партал TUT.by статусу СМІ. Адпаведны пазоў пасля чатырох папярэджанняў падаў Мініфарм, заявіўшы, што матэрыялы, за якія парталу былі вынесеныя папярэджанні, утрымліваюць недакладную інфармацыю і наносяць шкоду дзяржаўным інтарэсам. Праваабаронцы ўпэўненыя, што прычыны рашэння — палітычна матываваныя, а прынятыя за нязначныя парушэнні санкцыі выходзяць за межы дапушчальных абмежаванняў свабоды меркаванняў.

## VII. КАТАВАННІ І ЖОРСТКАЕ, БЕСЧАЛАВЕЧНАЕ, ЗНЕВАЖАЛЬНАЕ АБЫХОДЖАННЕ

У пачатку ліпеня апублікаваны вынік першага вымярэння Індэкса забароны катаванняў у краінах АБСЕ, які быў ініцыяваны Працоўнай групай па барацьбе з катаваннямі Платформы «Грамадзянская салідарнасць». Згодна з праведзеным даследаваннем, Беларусь заняла апошняе месца ў рэйтынгу постсавецкіх краін-удзельніц АБСЕ.

Падчас нападаў на ўдзельнікаў мірных акцый пратэсту супраць фальсіфікацыі вынікаў выбараў і іншых грамадзян, якія падазраюцца ў нелаяльнасці, у жніўні і наступныя месяцы супрацоўнікі сілавых падраздзяленняў адвольна, без дастатковых падставаў і не адэкватна існуючай сітуацыі ўжывалі фізічную сілу, зброю і спецсродкі, відавочна, маючы адпаведную санкцыю уладаў, што паўсюдна і сістэматычна парушала права не падвяргацца катаванням і забароненым відам абыходжання, а ў асобных выпадках — права на жыццё. Падрабязна абставіны поствыбарчых актаў гвалту і запалохвання, праведзеных АУС і іншымі падраздзяленнямі, апісаны ў дакладзе беларускіх праваабарончых арганізацый аб сітуацыі з правамі чалавека «Беларусь пасля выбараў», дзе зафіксаваныя і сістэматызаваны выпадкі катаванняў і забароненага абыходжання.

Па паведамленні Следчага камітэта, на 17 жніўня "больш за 600 грамадзян звярнуліся з заявамі аб атрыманні цялесных пашкоджанняў пры іх затрыманні супрацоўнікамі праваахоўных органаў, і каля 100 чалавек — аб атрыманні цялесных пашкоджанняў у месцах часовага ўтрымання". Больш актуальных дадзеных СК не публікаваў; кіраўнік Ленінскага РУУС г. Мінска В. Капілевіч на сустрэчы з жыхарамі раёна паведаміў аб 1 800 заявах грамадзян з нагоды прымянення гвалту да затрыманых падчас пратэстаў.

Ніхто з вышэйшых службовых асоб не асудзіў прымяненне катаванняў і жорсткага абыходжання ў дачыненні да ўдзельнікаў мірных сходаў і іншых грамадзян.

Заявы ахвяр катаванняў і забароненага абыходжання разглядаюцца павярхоўна, без распачынання крымінальных спраў і правядзення належных следчых дзеянняў. Характэрнай рысай вынесеных пастаноў аб адмове ва ўзбуджэнні крымінальнай справы ў розных рэгіёнах краіны з'яўляецца адсутнасць дадзеных аб магчымых падазраваных супрацоўніках АУС, адсутнасць іх апытанняў у сувязі з рэалізацыяй "мерапрыемстваў па абароне гонару, годнасці і дзелавой рэпутацыі, забеспячэння бяспекі супрацоўнікаў АУС". Таксама не праводзіцца дастатковых дзеянняў па фіксацыі слядоў злачынстваў і пошуку доказаў злачынстваў у дачыненні да грамадзян. Гэтыя пастановы грамадзяне абскарджваюць у суд і ў пракуратуру.

Суддзя Лідзія Цяліца з суда Маскоўскага раёна г. Мінска адну з такіх пастаноў па скарзе заяўніка адмяніла, матэрыял накіраваны для арганізацыі дадатковай праверкі.

Ужо летам гэтага года ўлады сталі ствараць у ізалятарах асабліва жорсткія ўмовы ўтрымання для палітвязняў, арыштаваных і затрыманых па палітычных матывах. Іх адвольна змяшчалі ў штрафныя ізалятары, падвяргалі правакацыям, абмяжоўвалі ў ежы, прагулках і ўтрымлівалі ў антысанітарных умовах.

Акрамя катаванняў і збіцця, зняволеныя ў мінскіх ізалятарах ГУУС падвергліся пакутам у сувязі са шматразовым перанасяленнем ізалятараў, адсутнасцю ежы, дастатковай колькасці вады, прагулак і іншых устаноўленых законам гарантый для адміністрацыйна затрыманых і арыштаваных.

Беспакаранасць злачынстваў правакуе новыя выпадкі забароненага абыходжання і катаванняў.

## VIII. ПАРУШЭННІ СВАБОДЫ АБ’ЯДНАННЯЎ

Узрослая пратэстная актыўнасць стала прычынай узмацнення ціску ўладаў на некамерцыйныя арганізацыі: зафіксаваныя неаднаразовыя факты правядзення праверак у некамерцыйных арганізацыях, ператрусаў у іх офісах і ў актывістаў НКА. Напрыклад, ператрусы прайшлі ў доме генеральнай сакратаркі Беларускага нацыянальнага маладзёжнага савета «РАДА» Ганны Дапшэвічуце, у дабрачынным фондзе «Палеская Дабрыня», у Гродзенскім дзіцячым хоспісе, праверкі — у фондзе «Краіна замкаў», установе «Нити дружбы».

У пачатку верасня ахвярай нападкаў кладаў стаў «Цэнтр па прасоўванні правоў жанчын — Яе правы»: некамерцыйную арганізацыю абвінавацілі ў фінансаванні пратэстаў.

12 лістапада прадстаўнікі праваахоўных органаў затрымалі лідараў і актывістаў «Задзіночання Беларускіх Студэнтаў» (ЗБС). У іх кватэрах і ў офісе арганізацыі прайшлі ператрусы. Сярод тых, хто трапіў пад рэпрэсіі, — Ксенія Сырамалот, Алана Гебрэмарыям, Ягор Канецкі, Яна Арабейка і Кася Будзько (знаходзяцца пад вартай у СІЗА па узбуджанай крымінальнай справе па ч. 1 арт. 342 КК). Многія актывісты ЗБС былі вымушаны пад пагрозай арышту выехаць з краіны. Такім чынам, дзейнасць арганізацыі ў Беларусі паралізаваная; улады нанеслі ўдар па адной з найстарэйшых моладзевых арганізацый краіны.

22 снежня затрыманыя кіраўніца Прэс-клуба Юлія Слуцкая, праграмная дырэктарка Ала Шарко, фінансавы дырэктар Сяргей Альшэўскі, кіраўнік Акадэміі Прэс-клуба Сяргей Якупаў, аператар Пётр Слуцкі, а таксама былая журналістка БТ Ксенія Луцкіна. Яны абвінавачваюцца ва ўхіленні ад выплаты падаткаў у асабліва буйным памеры і ўтрымліваюцца ў СІЗА.

## IX. ДЫСКРЫМІНАЦЫЯ

На 101-й сесіі Камітэт па правах чалавека ААН працягнуў разгляд сцвярджэнняў аб дыскрымінацыі ў дачыненні да прадстаўнікоў рома ў Магілёўскай вобласці ў Беларусі ў 2019 годзе. Камітэт адзначыў, што дзяржава не зарэгістравала скаргаў на масавыя арышты, празмернае прымяненне сілы, запалохванне і гвалт у дачыненні да асоб, якія належаць да суполкі рома, у кантэксце расследавання забойства міліцыянта. Камітэт занепакоены адсутнасцю бесстароннасці і эфектыўнасці працы камісіі па расследаванні, улічваючы яе склад, а таксама тым, што расследаванне было засяроджана на працэсуальных парушэннях, а не на сцвярджэннях аб дыскрымінацыі рома з боку праваахоўных органаў. Акрамя таго, адзначаючы прыняцце дысцыплінарных мер у дачыненні да афіцэраў і старэйшых службовых асоб МУС, Камітэт занепакоены тым, што не быў распачаты судовы пераслед і ахвярам не была выплачана кампенсацыя.

## X. ЗАХАВАННЕ СТАНДАРТАЎ СПРАВЯДЛІВАГА СУДА. ЦІСК НА АДВАКАТАЎ

Праваабаронцы, юрысты і эксперты канстатуюць глабальны крызіс, які зазнала ў другой палове года сістэма правасуддзя ў Беларусі.

Усе недахопы правасуддзя, адсутнасць па-сапраўднаму незалежнай судовай сістэмы сталі яшчэ больш відавочныя, калі суды і суддзі безумоўна ўключыліся ў рэпрэсіўны працэс, пасля чаго судаводства па палітычна матываваных справах страціла характар правасуддзя.

Ужо летам стала зразумела, што розныя меры — абмежаванне спатканняў у месцах зняволення, у тым ліку з адвакатамі, разгляд адміністрацыйных спраў шляхам не прадугледжаных законам сістэм відэаканферэнцыі — будуць выкарыстоўвацца для адвольнага абмежавання працэсуальных правоў затрыманых і арыштаваных. Таксама ўлады неаднаразова парушалі прынцып прэзумпцыі невінаватасці па палітычна матываваных справах.

У дні, калі ўдзельнікі мірных акцый пратэсту і іншыя людзі, якіх спецслужбы аднеслі да праціўнікаў існуючай улады, масава звазіліся ў ізалятары ГУУС Мінгарвыканкама і ў ізалятары іншых гарадоў, суддзі праводзілі канвеерныя пасяджэння прама ў гэтых ізалятарах, дзе затрыманыя падвяргаліся катаванням і забароненаму абыходжанню. Гэтыя і іншыя парушэнні стандартаў справядлівага судовага разбяральніцтва ў дачыненні да ўдзельнікаў мірных дэманстрацый супраць фальсіфікацый вынікаў прэзідэнцкіх выбараў 2020 года даследаваны ў дакладзе «Беларусь, жнівень 2020: “правасуддзе” для пратэстоўцаў», які падрыхтавалі Праваабарончы цэнтр «Вясна» і эксперты беларускага Дома правоў чалавека пры падтрымцы Міжнароднай федэрацыі за правы чалавека (FIDH) і Сусветнай арганізацыі супраць катаванняў.

Пасля шматлікія суддзі апынуліся датычнымі да пераследу людзей за ажыццяўленне імі сваіх правоў і свабод, а таксама да парушэння стандартаў справядлівага суда ў дачыненні да асуджаных па палітычных матывах.

Па палітычна матываваным абвінавачванні ў злачынстве ў следчым ізалятары знаходзіцца адвакат Максім Знак, а пад хатнім арыштам — адвакат Ілля Салей, якія аказвалі юрыдычную дапамогу штабу прэтэндэнта на пасаду прэзідэнта В. Бабарыку.

Як і ў папярэднія гады, пры ўзмацненні палітычнага супрацьстаяння Міністэрства юстыцыі ўзмацняе ціск на адвакатуру: з 16 кастрычніка пазбаўленыя ліцэнзіі адвакаты А. Пыльчанка і Ю. Леванчук. Падставай паслужылі некаторыя крытычныя выказванні А. Пыльчанкі аб бягучай грамадска-палітычнай сітуацыі ў СМІ і асабістая перапіска Ю. Леванчук; такія меры ў дачыненні да адвакатаў сур’ёзна супярэчаць прынцыпам неўмяшання дзяржаўных органаў у дзейнасць незалежных інстытутаў і адвольна абмяжоўваюць свабоду выказвання меркаванняў.

МУС і КДБ перашкаджаюць дзейнасці адвакатаў: пад выглядам барацьбы з распаўсюджваннем каронавіруса адвакаты часцяком пазбаўляюцца магчымасці сустрэцца сам-насам са сваімі падабароннымі, затрыманымі і арыштаванымі па палітычных матывах. Адвакатка Л. Казак была адвольна, па надуманых падставах, затрыманая супрацоўнікамі АУС і змяшчалася ў ізалятары ГУУС Мінгарвыканкама, а пасля незаконна аштрафаваная суддзёй, нягледзячы на відавочнасць дапушчанага самавольства.

Органы самакіравання адвакатуры пасля публікацыі 18 жніўня заявы з асуджэннем беспрэцэдэнтных парушэнняў канстытуцыйных правоў грамадзян Беларусі ў далейшым займалі вельмі стрыманую пазіцыю, абмяжоўваючыся абмеркаваннем бягучых праблем з прадстаўнікамі дзяржаўных органаў. Разам з тым варта з задавальненнем адзначыць характэрны для апошніх месяцаў высокі ўзровень салідарнасці шараговых адвакатаў і іх актыўную прафесійную дапамогу, часта бясплатную, ахвярам парушэнняў правоў чалавека, нягледзячы на складаныя ўмовы працы і пагрозы рэпрэсій.